**Новік В.М.,**
суіскальнік кафедры
харавога мастацтва

# АСАБЛІВАСЦІ МЕТАДАЎ АПРАЦОВАК У ЗБОРНІКУ "БЕЛАРУСКІЯ НАРОДНЫЯ ПЕСНІ СОЛЬНЫЯ І ХАРАВЫЯ З АКАМПАНЕМЕНТАМ ФАРТЭПІЯНА" (Мн., 1928 г., вып. 1)

Выданне калектыўнага зборніка з гарманізацыямі М.Аладава, А.Аленіна, М.Іпалітава-Іванава, Я.Прохарава звязана з утварэннем у 1923 г. у Маскве па ініцыятыве Камітэта асветы БССР Беларускай спеўнай камісіі, якая займалася апрацоўкай перададзеных ёй беларускіх народных песень, сабраных вядомымі фалькларыстамі таго часу: А.Грыневічам, У.Тэраўскім, Я.Янчуком і інш. На працягу года камісія апрацавала звыш 250 народных мелодый для сола і хору ў суправаджэнні фартэпіяна. У зборніку змешчана толькі частка гарманізацый членаў гэтай камісіі, у склад якой уваходзілі яшчэ і такія вядомыя рускія кампазітары, як А.Грэчанінаў і А.Нікольскі. Кампазітары пайшлі па шляху стварэння зборніка згарманізаваных народных песень у суправаджэнні фартэпіяна, працягваючы традыцыі М. Балакірава, М.Рымскага-Корсакава, А.Лядава. Зборнік утрымлівае нераўназначныя з мастацкага боку гарманізацыі, што сталася вынікам рознага ўзроўню майстэрства і глыбіні пранікнення ў нацыянальны мелас. Да таго ж ніхто з кампазітараў у сваіх гарманізацыях не ўказаў аўтарства запісу народных мелодый, што, безумоўна, зніжае навуковую каштоўнасць выдання.

У зборніку змешчана 10 беларускіх народных песень для голасу, жаночага ці дзіцячага хору ў суправаджэнні фартэпіяна з акампанементам кампазітара Я. Прохарава, які з 1924 года працаваў выкладчыкам тэорыі музыкі і кампазіцыі ў Мінскім музычным тэхнікуме. Палову іх складаюць згарманізаваныя дзіцячыя песні: гулянкі,

прыказкі і калыханкі. Прычым амаль усе астатнія пазначаны як мажлівыя для выканання дзіцячым хорам, што падкрэслівае ўвагу кампазітара да дзіцячых спеваў.

У аснову гарманізацый народных мелодый пакладзены прынцыпы ладавай захаванасці дыятанічнасці, народнасці голасавядзення, варыяцыйнасці, акрэслівання вядучага голасу (мелодыі).

Разам з народнымі прыёмамі аўтар выкарыстоўвае імітацыю, элементы кантрапункту ("Перапёлка"), розныя склады хору (аднагалосны — "Калыханка", двух- і трохгалосны; з сола, трыо і tutti — "Заінька"), такім чынам вар'іруючы і робячы больш разнастайнай харавую фактуру.

Суправаджэнне да некаторых песень утрымлівае гукавыяўленчыя моманты ("Ходзіць варабейка"), якія павінны дапамагчы ў раскрыцці характару і зместу дзіцячай песні. Аднак у цэлым акампанемент гарманізацый не заўсёды ўдалы, не захоўваюцца абазначаная ладавая аснова і характар народных мелодый. Кампазітар загрувашчвае вакальную частку нехарактэрнымі гарманічнымі сугуччамі ("Воўк і авечкі"), уводзіць новыя гукі да мелодый ("Гулі"), завяршае песні поўнымі класічнымі кадансамі (Д—Т), напрыклад "Я табун сцерагу", "Камар лазню тапіў", што неўласціва народнай песні. Да таго ж у песні "Камар лазню тапіў" няўдалае гукавыяўленчае суправаджэнне. Найбольш вартыя ў мастацкіх адносінах а капэльныя гарманізацыі Я.Прохарава, дзе кампазітар выяўляе сябе і як будучы майстар вядомых харавых апрацовак ("Ой, рана на Івана"), і як знаўца традыцый народнага спявання. Так, у найбольш удалай гарманізацыі песні "Прыляцела галка" (старадаўняя мелодыя, заснаваная на "славянскім трыхордзе") для трохгалоснага жаночага хору пераважае строгая дыятоніка (cis moll), ніжнія галасы (AI і AII) гарманічна, з элементамі імітацыі (у зачыне) і варыяцыйнасці суправаджаюць галоўную мелодыю, захоўваючы пры гэтым пэўную самастойнасць. Па-народнаму гучаць унісонныя і актаўныя заканчэнні на "Д". Песня "Завілася пчолка над

Рэпазіторый БДУКіМ

варатмі" (вяснянка) таксама трохгалосная: CI–AI–AII, дыятанічна згарманізаваная (Д — Dur), але з больш акрэсленымі элементамі варыяцыйнасці і самастойнасцю голасавядзення ў ніжніх галасах, якія сваімі ўнутрытактавымі распевамі кантрапунктуюць верхняму, што стварае ўяўленне руху ў карагодзе.

Некаторыя прыёмы гарманізацый народных песень, змешчаных у зборніку, будуць выкарыстаны кампазітарам ў яго наступных апрацоўках. Усяго Я.Прохаравым апрацаваны 82 беларускія народныя песні. 22 гарманізацыі А. Аленіна, найменш вядомага нам кампазітара, складаюць пераважную большасць з усіх астатніх. Аснова іх — гэта абрадавыя песні: вяснянкі, вясельныя, валачобныя, жніўныя, хрэсьбінныя, а таксама калыханкі, гульнявыя і лірычныя. Усе гарманізацыі зроблены для аднароднага складу хору ці голасу ў суправаджэнні фартэпіяна, толькі да адной песні зроблена заўвага на яе магчымае акапэльнае выкананне. Такая ўвага да суправаджэння тлумачыцца агульнай скіраванасцю ўсяго зборніка. Кампазітар не заўсёды ўказвае на склад выканаўцаў, агаворваючы гэта толькі ў асобных гарманізацыях ("Яшчур", "Чачотка" для жаночага хору, "Пагнала я кароўку" для дзіцячага хору), даючы адвольны выбар складу выканаўцаў.

Акампанемент гарманізацый у асноўным падабраны адпаведна характару песні, як і ўступ да іх. А напрыклад, гарманізацыя песні "Да разгарысь, вячэрняя зара" мае як разгорнуты інструментальны ўступ, так і заканчэнне. Выключэнне складаюць некаторыя гарманізацыі, дзе акампанемент змяшчае не зусім адпаведныя характару народнай песні рытмічныя элементы (калыханкі №4, №5), неўласцівыя меладычныя ходы ("Верабейка", "Наша бабка падпіла").

У агульнагалосных і гульнявых фактура суправаджэння больш разнастайная, паліфанізаваная ў выніку прымянення розных пасажаў, штрыхоў, арганнага пункта, элементаў варыяцыйнасці ("А люлі", "Верабейка"), што характэрна і для другіх аўтараў зборніка. У астатніх песнях

яна больш стрыманая, вертыкальна гарманічная, як бы дапаўняючая аднародны шматгалосны хор падгалоскамі ці змешанай "харавой фактурай" ("Радзі, сонца, жыта", "Гэй, вясна").

У некаторых песнях кампазітар выходзіць за рамкі гарманізацыі толькі аднаго куплста і дае некалькі яго варыянтаў: "Ой, ляцелі ды два галубочкі" — ІУ, "Гэй, вясна" — III, "Як у полі" — ІУ. У такіх гарманізацыях кампазітар як бы час ад часу "агаляе" харавое шматгалоссе: ашчаджаючы яго арганным гучаннем Т і Д ці кантрапунктам у суправаджэнні і надае яму ролю запеву, за якім ідзе харавы падхоп.

Кампазітар часцей захоўвае асноўную мелодыю ў верхнім голасе, узбагачаючы яе падгалоскамі, радзей вар'іруючы ўнутрытактавымі распевамі ці перадаючы ў іншыя галасы. Цікавая ў гэтым плане гарманізацыя песні "Як у полі", дзе, акрамя сказанага, кантрапункт у суправаджэнні пабудаваны на элементах галоўнай мелодыі.

Зыходзячы з теравагі абрадавых песень, амаль усе гарманізацыі А.Алсніна дыятанічныя, але для разнастайнасці гучання ці афарбоўкі ён выкарыстоўвае лады народнай музыкі і альтэрыраваныя ступені ладу: дарыйскі — "Ой, загуду" (#VI — moll), міксалідзійскі — "Ой, вечар, вечар" (VIIb — Dur), спалучэнне ладоў — "Як у полі", "Гэй, ды люлі" — #VI.

У гэтым кантэксце падаюцца як неадпаведныя ладаваму боку народнай песні некаторыя гарманізацыі: напрыклад №5 ("Калыханка"), дзе замест натуральнага мінору кампазітар ужывае C-Dur. Ён часта прымяняе унісоны, падгалоскі, розныя элементы народнага шматгалосся. Сярод апошняга адзначым "гуртавы" спеў ("Ай, вечар, вечар"), кантавую традыцыю ("Як пайшоў Мікола"), гетэрафонна-унісонны ("Наша бабка падпіла", "Асовае карыта"). Выкарыстанне жывой спеўнай традыцыі было вынікам добрага ведання з боку кампазітара асаблівасцей і манеры народнага спеву, а таксама школы, атрыманай у М.Балакірава і А.Лядава. Для раскрыцця

Репозиторий БГУКИ

вобразаў песень кампазітар выкарыстоўвае імітацыю квінтамі валынкі ў песнях "А мой дзядзька дуднік быў", "Чачотка", шырока ўжывае кварта-квінтавыя і секундавыя сугуччы.

Такім чынам, дыяпазон усіх музычных сродкаў, выкарыстаных кампазітарам у сваіх песнях, набліжае яго гарманізацыі да жанру апрацоўкі.

У зборніку змешчана адна гарманізацыя М. Аладава, гэта аднагалосная калыханка "Ладкі — ладушкі" з акампанементам, пабудаваным на асціната і арганным пункце, і аднагалосныя гарманізацыі М.І. Іпалітава-Іванава "Свяці, свяці, месячыку" (вясельная) і "Ну, ну, ну, казёл" (шчадроўка). Для дзвюх апошніх характэрна квінтовае асціната ў басе на тоніцы, імітуючае найгрыш, верхні голас падтрымлівае мелодыю, а сярэдні яе дапаўняе падгалоскамі. Акрамя таго, першая гарманізацыя больш разнастайная па сваёй рухомай дынаміцы і акцэнтах, якія падкрэсліваюць гульнявы характар вясельнай песні.

Гэтыя ж дзве фартэпіянныя гарманізацыі (да народных мелодый) вылучаюцца з усяго зборніка сваёй класічнай дасканаласцю, лаканічнасцю і прастатой у прымяненні музычных сродкаў, удала перадаюць самабытны характар беларускіх народных напеваў.

Такім чынам, кампазітарамі-аўтарамі калектыўнага зборніка была закладзена аснова для далейшай творчай працы над беларускай народнай песняй. Многія творы са зборніка передрукоўваліся ў больш позніх і сучасных выданнях, а таксама мелі і могуць мець практычнае выкарыстанне ў спеўна-харавой практыцы.

Найбольш яркія адмыслова-мастацкія апрацоўкі народных беларускіх песень, створаныя кампазітарамі М.Аладавым, Я.Прохаравым, А.Грэчанінавым, А.Нікольскім як у акапэльным жанры, так і ў жанры спеву з суправаджэннем, складаюць залаты фонд беларускай музыкі.

Репозиторий БГУКИ